**ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна
# за сакавік 2021 г.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага дня

**5 сакавіка**

У Інтэрнэце адбылася прэзентацыя віртуальнай кніжнай выстаўкі «Женщины в зеркале эпохи», прымеркаванай да Міжнароднага жаночага дня.

ЦБ

Вакальны гурт «Фантазия» цэнтральнай раённай бібліятэкі павіншаваў чытачоў і калег с Міжнародным жаночым днём відэакліпамі з выкананнем песень, якія размясцілі на сайце ЦБС і ў групе бібліятэкі ў сацыяльных сетках.

ЦБ

**7 сакавіка**

ЛПГ «Молодость» Магдалінскай публічнай бібліятэкі падрыхтавала літаратурна-музычную кампазіцыю «Образ пленительный, образ прекрасный». Дзеці чыталі вершы, гралі на фартэпіяна, выконвалі частушкі і песні. Госці мерапрыемства знаёміліся з выданнямі, прадстаўленымі на кніжнай выставе, і ўдзельнічалі ў бяспройгрышнай латарэі.

Магдалінская ПБ, 33 чал.

Конкурсна-гульнявая праграма «Девичий переполох» у бібліятэцы была прысвечана 8 Сакавіка. У разнастайных конкурсах паміж сабой спаборнічалі каманды дзяўчынак «Ромашка» і «Звёздочка». У выніку перамагло сяброўства, усе удзельніцы атрымалі памятныя падарункі. Праведзены агляд кніжнай выставы «Кто на свете всех милее».

Гарадзецкая ПБ, 17 чал.

## Мерапрыемствы да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

**11 сакавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылася прэзентацыя выстаўкі «Галоўны закон жыцця краіны», на якой прадстаўлены тэксты ўсіх пяці Канстытуцый Беларусі, кнігі і матэрыялы з перыядычных выданняў аб канстытуцыйным развіцці нашай краіны.

ЦБ, 35 чал.

**15 сакавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры раённай бібліятэкі прайшоў урок грамадзянскасці «Канстытуцыя – асноўны закон беларускай дзяржавы», у якім пряняў удзел старшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна Раман Гушчын. Навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа прынялі актыўны

ўдзел у інтэлектуальна-прававой віктарыне і прававым трэнінгу «Работа з даведачна-прававой сістэмай «ЭТАЛОН-WIN».

ЦБ, 21 чал.

**17 сакавіка**

У рамках праекта «Шаг – школа активного гражданина» для 5 – 6 класаў Лукскай сярэдняй школы ў бібліятэцы праведзена гадзіна прававых ведаў «Закон суров, но один для всех». У канцы мерапрыемства вучні ўдзельнічалі ў літаратурнай віктарыне «Права сказочных героев».

Лукская ПБ, 9 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**5 сакавіка**

Бясплатная кансультацыя натарысаў у публічным цэнтры прававой інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дала старт сумеснаму праекту ПЦПІ і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва». Быў арганізаваны папярэдні запіс па тэлефоне. *(Кобрин-информ. 2021. 11 марта.)*

ЦБ, 17 чал.

**14 сакавіка**

У рамках праекта «Библиотека – открытая площадка» ў бібліятэцы праведзена фальклорная гульнявая праграма «Встречай, народ, Масленица идёт!». Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў гульнях і конкурсах «Сковородка», «Петушки», «Ключники», «Метание снежков», адгадвалі загадкі. Мерапрыемства закончылася частаваннем блінамі і чаяваннем.

Балоцкая ПБ, 18 чал.

**18 сакавіка**

Літаратурная гасціная «Паэтычны Кобрын» сабрала ў бібліятэцы вучняў 7 – 11 класаў Залескай сярэдняй школы. Члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Наталля Кандрашук, Генадзь Жук, Кацярына Кароль і Валянціна Пігас дзяліліся сваёй паэтычнай творчасцю з прысутнымі. Тыя, хто піша вершы, знайшліся і сярод гледачоў. Пераможца невялічкага конкурсу атрымаў у якасці прыза кнігу Наталлі Кандрашук «Зимний букет», а Валянціна Пігас сваю аўтарскую кнігу «Не губляю свае карані» падарыла бібліятэцы. *(Кобрин-информ. 2021. 25 марта.)*

Залеская ПБ, 53 чал.

**21 сакавіка**

У Сусветны дзень паэзіі паэты Кобрыншчыны сабраліся ў цэнтральнай раённай бібліятэцы. Сустрэча прайшла ў фармаце адкрытага мікрафона «Калі душа з душою размаўляе». Сваімі вершамі з прысутнымі дзяліліся 20 паэтаў – члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» і народнага аматарскага аб’яднання «Белый аист». Прачытаць любімы верш вядомага аўтара мог і кожны жадаючы з гледачоў. Упрыгожваннем мерапрыемства сталі песні пад гітару і баян і

акапэльнае выкананне. Завяршылася сустрэча відэапрывітаннямі з Дзівіна, Брэста і Масквы. *(Кобрин-информ. 2021. 25 марта; Заря. 2021. 27 марта.)*

ЦБ, 26 чал.

**24 сакавіка**

У конкурсе выразнага чытання «Чытайце самі, чытайце з намі, чытайце лепей за нас!» у бібліятэцы спаборнічалі трынаццаць канкурсантаў. Падарункам гледачам і ўдзельнікам стала тэатралізацыя казкі «Репка» на новы лад. Цікавасць у дзяцей выклікалі кніжная выстаўка «Беларускія пісьменнікі ў госці да вас!» і выстаўка-сюрпрыз «Кот в мешке».

Залеская ПБ, 64 чал.

**26 сакавіка**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў дзень прафесійных зносін «Публічная бібліятэка на сучасным этапе, ці Вяртанне да сацыякультурнай дзейнасці», у якім удзельнічалі бібліятэкары публічных бібліятэк раёна. Ад супрацоўнікаў аддзела бібліятэчнага маркетынгу ўдзельнікі даведаліся пра метады і накірункі дзейнасці бібліятэк у постэпідэміялагічны перыяд, пазнаёміліся з электронным банкам гатовых прыкладаў афармлення бібліятэк «Стварыць новы вобраз», новымі задачамі, якія стаяць перад аматарскімі клубамі пры бібліятэках. Асабістыя напрацоўкі па афармленню прадставіла бібліятэкар Лукскай публічнай бібліятэкі.

ЦБ, 32 чал.

**26 сакавіка**

**Мінск.** Па выніках 1-га Рэспубліканскага конкурсу творчых пісьмовых работ «За што я люблю родную зямлю» чатыры члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» цэнтральнай раённай бібліятэкі сталі пераможцамі. Імпрэза, на якой адбылося ўзнагароджанне, прайшла ў Прэзідыуме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Творчасць кабрынчан адзначана ў дзвюх намінацыях. Бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу, кіраўнік клуба «ПоэтиКо» Наталля Ефціфеева (Кандрашук), члены клуба Алена Котава і Марына Міхалюк атрымалі дыпломы пераможцаў і прызы ў намінацыі “Магутная сіла паэзіі”, а Сцяпан Давыдзюк – у намінацыі “Мова маёй Радзімы”.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**10 сакавіка**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік вершаў члена літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Валянціны Пігас «Не губляю свае карані». У беларускамоўных вершах паэт дзеліцца з чытачамі любоўю да малой радзімы, назіраннямі за прыродай, разважаннямі аб жыцці. Асобным раздзелам ідуць вершы для дзяцей.

ЦБ

Ефціфеева Н. П.
8-01642-3-85-81